# СКОРАГАВОРКІ, ПРЫКАЗКІ, ЗАГАДКІ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

***І.Г. Гуд*** *(УА МДПУ імя І.П. Шамякіна)*
Навуковы кіраўнік – В.Я. Барысенка, канд. філал. навук, дацэнт

Сёння ў сферы адукацыі вялікая ўвага надаецца выкарыстанню гульні ў навучанні і выхаванні малодшых школьнікаў. Стварэнне гульнёвых сітуацый садзейнічае актывізацыі працэсу навучання. Такія сітуацыі могуць быць створаны шляхам выкарыстання ў навучальна-выхаваўчым працэсе загадак, скорагаворак і прыказак, якія развіваюць пазнавальную актыўнасць вучняў, іх творчае уяўленне, вобразнае мысленне.

Прыказкі, скорагаворкі і загадкі неабходны вучням, як матэматычныя задачы, таму што яны вучаць: пазнанню навакольнага асяроддзя, гаварыць ярка, вобразна, проста, задумвацца над заканамернасцямі, якія адбываюцца ў прыродзе, прывучаюць да назіральнасці, развіваюць мастацкі густ. Таму асноўная мэта настаўнікаў пачатковых класаў у гэтым напрамку – далучэнне дзяцей з першых школьных дзён да беларускай спадчыны, нацыянальнай культуры, жыцця і працы беларускіх людзей, прывіццё школьнікам цікавасці і любові да роднага слова і мовы.

Загадка – адзін з самых старажытных фальклорных жанраў. Важнейшымі функцыямі загадак з’яўляюцца: праверка і трэніроўка кемлівасці дзяцей, развіццё іх лагічнага і паэтычнага мыслення, уменне пазнаць навакольную рэчаіснасць у іншасказальных вобразах. Нямалаважнымі з’яўляюцца таксама павучальная, выхаваўчая, пацяшальна-забаўляльная і гульнёвая функцыі. У загадках адлюстраваны з’явы навакольнага асяроддзя, прырода, знаёмы вучням свет. Урокі з выкарыстаннем загадак праходзяць цікава і не стамляюць вучняў, даючы ім карысныя практыкаванні для розуму.

Трэба зазначыць, што выкарыстанне скорагаворак і прыказак мае такое ж значэнне. Высока цэніць народ сілу і значэнне праўдзівага, добрага, чэснага і цвёрдага слова. Прыказкі хваляць лепшыя якасці чалавека, ганяць яго недахопы. З асаблівай сілай выражаюцца ў прыказках любоў да Радімы і клопат аб ёй. Прыказкі і скорагаворкі ўзбагачаюць мову, надаюць ёй выразнасць і дакладнасць.

Такім чынам можна адзначыць, што работа з прыказкамі, скорагаворкамі і загадкамі вядзецца на любым этапе ўрока, пры тлумачэнні новага і замацавані вывучанага матэрыялу, самастойнай і выбарачнай рабоце, але ў любым тыпе работы гэтыя жанры народнага фальклёру аказваюць эмацыянальнае ўздзеянне на развіццё пазнавальных здольнасцей дзяцей, што станоўча адлюстроўваецца на навыках, ведах і уменнях вучняў.



МГПУ им. И.П. Шамякина